Доўгая і пякучая, як памяць, сырамятная *пуга* хай ня дасьць супыну вечнаму руху.

# Путч

***Уладзімер Арлоў***

Слова паходзіць ад нямецкага „*Putsch*“ і азначае спробу дзяржаўнага перавароту.

Пасьля няўдалага гітлераўскага піўнога *путчу* і прыходу да ўлады чорных палкоўнікаў у Грэцыі Заходняя Эўропа гучных *путчаў* ня ведала. *Путчы* адбываліся пераважна ў Афрыцы, Азіі ды Лацінскай Амэрыцы, дзе іх часам бывала, як грыбоў у дажджлівую восень.

Але пры канцы стагодзьдзя выявілася, што такі экзатычны плод, як *путч*, можа высьпець і ў нашых геаграфічных шыротах. У жніўні 1991 году на практыцы даведаліся пра *путч* і народы Савецкага Саюзу, якія ўжо рыхтаваўся „даць дуба“.

Кажуць, у буфэце менскага Дому ўраду тады вокамгненна зьніклі гарэлка і каньяк. Зачыніўшыся ў кабінэтах, беларускае чынавенства ўсіх узроўняў сьвяткавала канцы перабудове.

Палітолягі схільныя лічыць *путчам* і антыканстытуцыйны лістападаўскі пераварот 1996 году ў Беларусі.

Наступствы пераможных *путчаў* ува ўсіх кутках сьвету аднолькавыя: захоп улады, дыктатура, рэпрэсіі, зьнікненьне актыўных апазыцыянэраў.

*Путчысты* панічна баяцца адзіноты. *Путчысты* сьняць кепскія сны. *Путчысты* ведаюць, што іх чакае або зьдзейсьнены былымі хаўрусьнікамі новы *путч*, або зьдзейсьненая народам рэвалюцыя. Вынік звычайна аднолькавы — турэмная камэра й прысуд.

# Пыл

***Анатоль Вярцінскі***

Чаго добрага, а *пылу* ў беларусаў заўсёды было досыць. *Пыльныя* сьцяжыны-дарогі, *пыльныя* пятачкі-вулачкі, *пыльныя* ляды, палеткі ды гэтыя самыя выратавальныя соткі.

А яшчэ беларусам пускалі слоўны *пыл* у вочы, пудрылі мазгі розныя дабрадзеі. Многіх сьцёрлі і ў лягерны *пыл*. *Пыл* той, тыя попел і прах балюча стукаюць у нашыя сэрцы.

Выпала на долю беларусу зьведаць больш, чым каму-небудзь, і *пылу* радыяактыўнага, чарнобыльскага, гэтых самых альфа- і бэта-часьцінак, так званых часьцінак гарачых. Мабыць, меў рацыю паэт, калі пэсымістычна зазначыў:

Змагацца з *пылам* —
Тое, што быць Пірам,
Сілаў усё меней,
А *пылу* ўсё многа:
Пірава перамога.

Ды з другога боку, момант ісьціны надыходзіць тады, калі асядае *пыл*.